**Кацярына ВАРАНЬКО,**
вядучы бібліёграф Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі

# Каралева рапіры

## 28 ліпеня – 70 гадоў з дня нараджэння Алены Бяловай – заслужанага дзеяча фізічнай культуры Беларусі, заслужанага трэнера Беларусі



*Каля 20 гадоў Алена Дзмітрыеўна Бялова адстойвала гонар краіны на міжнародных турнірах. Энергічная, працаздольная, мэтанакіраваная, яна пераўзыходзіла многіх сваіх саперніц. Імя Алены Бяловай як абсалютнай рэкардсменкі па колькасці заваяваных медалёў па фехтаванні на рапірах сярод жанчын занесена ў Кнігу рэкордаў Гінеса.*

Нарадзілася Алена Бялова ў г. Савецкая Гавань Хабараўскага краю. У юнацтве займалася баскетболам, танцамі, спевамі. Калі неспадзявана трапіла ў спартыўную залу, дзе ішло спаборніцтва фехтавальшчыкаў, то была ў захапленні ад гэтага віду спорту. Моцнае ўражанне на яе аказалі рашучыя паядынкі двух сапернікаў у прыгожых белых «рыцарскіх» касцюмах, шлемах, з бліскучымі шпагамі. У хуткім часе прыняла рашэнне наведваць фехтавальную секцыю. Заслужаны трэнер СССР Л. П. Бокун бачыла, што яе вучаніца валодае адметнымі якасцямі фехтавальшчыцы, таму старалася развіць і замацаваць іх.

Педагог акрамя спецыяльных тэхнічных элементаў вучыла запамінаць свае рухі, аналізаваць завершаны бой, шмат увагі аддавала псіхалогіі. Алена Дзмітрыеўна авалодвала ўсімі навыкамі з неверагоднай хуткасцю. Ужо праз два з паловай гады была ўключана ў юнацкую зборную СССР. Пяць разоў яна станавілася чэмпіёнкай СССР сярод моладзі, двойчы займала першую ступень на маладзёжным чэмпіянаце свету. А ў 1967 г., будучы дэбютанткай, адразу стала сярэбраным прызёрам на спаборніцтвах па праграме Спартакіяды народаў СССР і ўвайшла ў алімпійскую зборную СССР, у складзе якой былі вядомыя фехтавальшчыцы Г. Я. Гарохава, А. І. Забеліна, Т. Д. Самусенка і інш.

Ні ў адным з рэйтынгаў, апублікаваных перад XIX летнімі Алімпійскімі гульнямі (1968, Мехіка), прозвішча Алены Дзмітрыеўны не значылася, але менавіта яна стала адзінай фехтавальшчыцай, узнагароджанай двума залатымі медалямі (у асабістым і камандным заліках). Стратэгіі А. Д. Бяловай – неспадзявана імклівая весці серыю бесперапынных нападаў – аказаліся не ў стане супрацьстаяць нават нядаўнія фаварыткі міжнародных турніраў.

Высокая, гнуткая, хуткая, спартсменка валодала бясспрэчнай вытрымкай, стрыманасцю, моцнай воляй і стойкасцю. Міжнародная федэрацыя фехтавання ўнесла А. Д. Бялову першым нумарам у спіс найлепшых рапірыстак алімпійскага года. Ёй таксама прысудзілі «Прыз нечаканасці» Міжнароднай федэрацыі журналістаў. На радзіме фехтавальшчыцу ўзнагародзілі ордэнам Дружбы народаў. У 1968 г. яна стала заслужаным майстрам



спорту СССР. Алена Дзмітрыеўна Бялова – чэмпіёнка XX, XXI летніх Алімпійскіх гульняў (1972, Мюнхен; 1976, Манрэаль – у камандным, бронзавы прызёр у асабістым заліку), сярэбраны прызёр XXII летніх Алімпійскіх гульняў (1980, Масква – у камандным заліку). Яна таксама чэмпіёнка свету ў асабістым (1969) і камандным (1970, 1971, 1974, 1975, 1977–1979) заліках; сярэбраны прызёр у асабістым заліку (1970, 1977); 14-разовая ўладальніца Кубкаў Еўропы; 21-разовая чэмпіёнка СССР, Спартакіяд народаў СССР, уладальніца Кубкаў СССР; пераможца адкрытага чэмпіянату Аўстрыі (1977), самых прэстыжных міжнародных турніраў (на прыз «Сярэбраная рапіра» – 1968, 1969, 1972, Італія; «Жанці» – 1973, 1974, 1979, Францыя; «Сем нацый» – 1976–1979, Германія) і інш. За кожным трыумфам спартсменкі – тытанічная праца, уменне правільна размеркаваць свае сілы. У 1979 г. яна стала заслужаным дзеячам фізічнай культуры Беларусі, у 1994 г. заслужаным трэнерам Беларусі.

Алена Бялова заўсёды паспяхова сумяшчала спорт і вучобу. Скончыла Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А. М. Горкага (1971), Вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПБ (1983). У 1979 г. стала кандыдатам педагагічных навук, у 1993 г. – прафесарам. З 1983 да 1998 г. узначальвала кафедру педагогікі і псіхалогіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта фізічнай культуры. Яна аўтар многіх навуковых даследаванняў, навучальных дапаможнікаў і інш. Была членам выканкама Нацыянальнага алімпійскага камітэта Беларусі (1991–2000). З'яўлялася дырэктарам Вышэйшай школы трэнераў (2006–2010), старшынёй Савета спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў (2007–2011). Яна прадстаўнік Беларусі ў Еўрапейскай асацыяцыі «Жанчыны Еўропы і спорт». У 2007 г. стала ганаровай грамадзянкай Мінска. У 2015 г. уключана ў Залу славы Міжнароднай федэрацыі фехтавання.

Алена Дзмітрыеўна ўзнагароджана трафеем «За алімпійскія ідэалы» ў сувязі са 100-годдзем алімпійскага руху (1994), двума ордэнамі «Знак Пашаны», ордэнам Айчыны III ступені, сярэбраным ордэнам Міжнароднага алімпійскага камітэта (1997), медалём П'ера дэ Кубертэна (2007) і інш. З'яўляецца ганаровым дынамаўцам СССР.

### Спіс выкарыстаных крыніц

**Белова, Е. Д.** Психология спорта – спорту высших достижений : пособие / Е. Д. Белова, Г. В. Ложкин ; М-во спорта и туризма Респ. Беларусь ; УО «Белорус. гос. ун-т физ. культуры». – Минск : БГУФК, 2009. – 131 с.

### Пра жыццё і дзейнасць А. Д. Бяловай

**Бялова (дзявочае Новікава) Алена Дзмітрыеўна** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 1996. – Т. 3. – С. 399.

**Белова (девичья Новикова) Елена Дмитриевна** // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 7 т.]. – Минск, 2006. – Т. 2. – С. 251.

**Белова (дев. Новикова) Елена Дмитриевна** // Спортивная энциклопедия Беларуси. – Минск, 2005. – С. 62.

**Белова (дев. Новикова) Елена Дмитриевна** // Энциклопедия белорусского физкультурно-спортивного общества «Динамо» : 90 лет, 1923–2013 / [сост. : А. А. Мушта, Е. И. Павловский ; редкол.: Т. В. Белова (гл. ред.) и др.]. – Минск, 2013. – С. 378.

**Васильев, Р. А.** Елена Белова. Королева побед : очерк / Р. А. Васильев. – Минск : Маст. літ., 2012. – 115 с.

**Васильев, Р. А.** Елена Белова. Способность восхищать / Р. А. Васильев. – Минск : Кавалер, 2007. – 63 с.

**Мяснікоў, А. Ф.** Алена Бялова: Тытул за тытулам, званне – за званнем... / А. Ф. Мяснікоў // Сто асоб беларускага спорту : нарысы. – Мінск, 2009. – С. 90–93.

**Стэльмах, В. В.** Бялова Алена Дзмітрыеўна / В. В. Стэльмах // Беларусь у асобах. – Мінск, 2011. – С. 32–35.

**Цярэнцьева, А.** Непераможная / А. Цярэнцьева // Алеся. – 2016. – № 8. – С. 60–62.

**Васильев, Р.** «Неправдивый» юбилей / Р. Васильев // Олимп. – 2007. – № 2. – С. 29–32.

**Белова, Е. Д.** Елена Белова: «Совсем неплохо быть романтиком!» / беседовал Александр Каменчуков // Минская школа сегодня. – 2007. – № 11. – С. 10–15.

*Фота да артыкула з інтэрнэт-крыніц*